

І ЗНОЎ УЗНІМАЦЦА Ў НЕБА

Васіль Аляксандравіч Дзямідаў — карэнны віцябчанін. У 1940 годзе скончыў Віцебскі аэраклуб і стаў чырвонаармейцам.

З красавіка 1943 года — на Заходнім і 3-м Беларускім франтах. Старшы лейтэнант В. А. Дзямідаў вызначыўся ў баях на Смаленшчыне, у Беларусі і Усходняй Прусіі.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 19 красавіка 1945 года.

Да 1961 года служыў у Савецкай Арміі. Пасля выхаду ў запас працаваў у сярэдняй школе № 21 Віцебска настаўнікам працоўнага навучання.

З 1967 па 1982 год — дыспетчар Віцебскага авіяпрадпрыемства. Цяпер — на пенсіі.

(З біяграфіі).

Вуліца Аркадзя Маўзона — адна з самых ціхіх мясцін старога Віцебска. Аднапавярховыя драўляныя дамы, таполі ўздоўж набярэжнай Заходняй Дзвіны, нячастыя летам гудкі катэраў нагамінаюць старую вёску з яе спакоем і размеранасцю жыцця.

Тут, на высокім беразе ракі, Васіль Аляксандравіч любіць адпачыць і цяпер, успомніць дзяцінства...

Колькі разоў, яшчэ хлапчуку, сніўся Дзямідаву адзін і той жа сон: быццам ён, раскінуўшы рукі, як крылы, плаўна, як тая чайка, ляціць над роднай Дзвіной, у сіняве неба, насустрач далёкаму зманліваму гарызонту.

Тады, у трыццатыя гады, усе хлопчыкі ўлюбляліся ў неба, вядомых лётчыкаў, стараліся раўняцца на іх. І не дзіўна, што Вася Дзямідаў спачатку набыў крылы ў Віцебскім аэраклубе, а потым спрабаваў іх на моцнасць у школе пілотаў горада Барысава. Прафесія ваеннага лётчыка тады была патрэбна не проста яму, хлопцу з ціхай вуліцы, а ўсёй краіне.

...У нядзелю, 22 чэрвеня 1941 года, Дзямідаў, як і яго таварышы курсанты, быў у летнім лагеры. Уперадзе — выхадны. Думаў парыбаліць на ціхай рэчцы Начы, пакупацца, пазагараць.

Нехта з будучых лётчыкаў звярнуў увагу на самалёты, якія ў такую рань крузгзлі ў паветры ў баку ад Барысава. Адсюль, з-пад Крупак, здавалася, што ідуць манеўры. Але вось, запылаўшы факелам, рухнуў уніз адзін, задыміў і знік за гарызонтам другі...

Хутка была аб'яўлена баявая трывога. Зампаліт, збіваючы ботамі не прасохлую яшчэ расу, падышоў да прыціхшага строя:

— Вайна, таварышы!

Яшчэ два гады, ужо ў Сібіры, перавучваўся Дзямідаў лятаць на больш магутных, сучасных самалётах. Васіль Аляксандравіч стаў камандзірам пікіруючага бамбардзіроўшчыка ПЕ-2, абсталяванага для паветранай разведкі. Баявое хрышчэнне атрымаў на Заходнім фронце ў небе Смаленшчыны ў 1943 годзе. А ў памятным 1944-м пачалося вызваленне яго роднай Беларусі. Палётныя заданні былі ўсё больш складанымі. Вораг шалёна абараняўся, стварай фальшывыя аэрадромы, умела маскіраваўся на прыродных рубяжах.

Адзін з іх — рака Бярэзіна. Трэба было разведаць, ці ёсць там варожыя ўмацаванні і што яны з сябе ўяўляюць. І, канечне, усё сфатаграфаваць. «Прапрасаваў» Дзямідаў уздоўж усю мяркуемую абарону праціўніка і са спакойным сэрцам пайшоў да сваіх. Але раптам насустрач паказаліся чатыры «Фоке-Вульфы-190». На іх фюзеляжах нахабна красаваліся бубновыя знакі. «Тузы» ляцелі спакойна, упэўнена, мяркуючы, што здабыча будзе лёгкай.

Дзямідаў і раней сустракаўся з фашысцкімі знішчальнікамі, але гэта былі баі адзін на адзін, і экіпаж ПЕ-2 выходзіў пераможцам. А тут — адразу чацвёра на аднаго. Але «пешка» не звярнула ў бок, а смела пайшла ў атаку. Трапным агнём стралок-радыст Іван Мінаеў паслаў на зямлю аднаго «бубновага туза», ад пападання штурмана Уладзіміра Палаўценкі ўзарваўся ў паветры другі.

Але тут (трэба ж такому здарыцца!) заела абодва кулямёты. Фашысты шалёна рынуліся на савецкі самалёт. І тады Дзямідаў стаў кідаць машыну з крыла на крыло: у экіпажа цяпер была адна мэта — уцячы ад праследавання, даставіць важныя развединыя ў полк. З прабітымі плоскасцямі, але ўсё ж адарваўся экіпаж ад ворага. Заданне было выканана.

Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю Дзямідава і яго экіпажа ва Усходняй Прусіі. У час фатаграфавання абароны праціўніка пад Гумбіненам у лістападзе 1944 года дзямідаўцы трапілі пад знішчальны агонь зенітак. Адзін снарад трапіў у бак з палівам. Пападанне было «шчаслівым» — самалёт не загарэўся. Спыніўся правы рухавік. Але і на адным маторы экіпаж працягваў выконваць заданне.

Кабіну пілота запоўнілі ядавітыя пары бензіну. Было цяжка глядзець, слязіліся вочы, стрэлкі прыбораў, здавалася, скакалі, як звар'яцелыя. Але пакуль не былі сфатаграфаваны апошнія кіламетры абарончай паласы ворага, экіпаж упарта выконваў заданне. Ледзь пераваліўшы перадавую, Дзямідаў вымушан быў пасадзіць баявую машыну на «пузо». Пры пасадцы і сам, і штурман атрымалі раненні.

Праз месяц з невялікім Дзямідаў вярнуўся ў строй. І зноў баявыя вылеты, зноў фатаграфаванне, зноў баі.

У красавіку 1945 года экіпажу старшага лейтэнанта Дзямідава было даручана, бадай, самае складанае і вельмі адказнае заданне: сфатаграфаваць на нізкай вышыні Кёнігсберг. Суправаджаемы 12 знішчальнікамі палка «Нармандыя—Нёман», Дзямідаў амаль гадзіну «вісеў» над варожай цытадэллю. Люты агонь зенітак быў вельмі шчыльным. Чарговым пападаннем разбіла масляны радыятар аднаго з матораў. Каб пазбегнуць закліньвання і выбуху, Дзямідаў яго выключыў. Заданне выканалі і на адным. І ў другі раз, калі спатрэбіўся яшчэ больш падрабязны план крэпасці, паслалі Дзямідава. І зноў яго падбілі. Але заданне і на гэты раз было выканана да канца і прытым бліскуча.

За гады вайны экіпаж сфатаграфаваў больш 24 тысяч квадратных кіламетраў тэрыторыі, занятай ворагам, 165 дзеючых аэрадромаў. Было выяўлена каля 1700 самалётаў, больш 900 чыгуначных эшалонаў і саставаў, звыш 32 тысяч аўтамашын з жывой сілай і тэхнікай ворага. І па ўсіх гэтых цэлях былі нанесены сакрушальныя ўдары. Ад трапных чэргаў экіпажа Дзямідава знайшлі свой канец 8 самалётаў праціўніка.

Лётчык 10-га асобнага паветрана-разведвальнага палка Трэцяга Беларускага фронта камуніст В. А. Дзямідаў прайшоў баявы шлях у авіяцыі ад сяржанта да палкоўніка. Цяпер Васіль Аляксандравіч на заслужаным адпачынку, але не сядзіць дома. Ён часты госць піянераў і камсамольцаў школ і вучылішчаў горада. Яго ўспаміны аб сваёй маладосці — як чарговае баявое заданне: даводзіцца зноў і зноў перажываць мінулае, быццам зноў узнімацца ў неба.

М. КОНАН.